**Ігнаценка, Т.** Ён быў на той вайне / Т. Ігнаценка // Сцяг перамогі (Лёзна). — 2014. — 14 лют. — С. 7.

# ЁН БЫЎ НА ТОЙ ВАЙНЕ



**Сустрэча з гэтым надзвычай спакойным, ураўнаважаным і сціплым чалавекам навяла на думку, што калі чалавек моцны духам, выпрабаванні надаюць яму яшчэ больш сілы. Міхаіл Генадзьевіч Расколаў – просты вясковы працаўнік. Нарадзіўся, вырас і ўвесь час жыве ў Пушках. Сям'я, з якой ён выйшаў, славілася любоўю да працы. Маці, Тамара Андрэеўна, аддала шмат гадоў жывёлагадоўлі. Спачатку рабіла даяркай, затым узначальвала ферму. Бацька, Генадзь Канстанцінавіч, трактарыст. Сваіх чацвярых дзяцей яны змалку прывучалі не сядзець без справы. Мішу, дарэчы як і братоў Сяргея і Аляксандра, цягнула да тэхнікі. Таму пасля васьмі класаў, якія ён скончыў у СШ № 1 г. п. Лёзна, хлопец пайшоў на курсы трактарыстаў, а сярэднюю школу заканчваў завочна. Пасля тры гады працаваў у калгасе імя Чапаева. У 1985 годзе прызвалі ў армію.**

– Мяне і яшчэ двух хлопцаў, Лёню Хмяльніцкага з Якубаўшчыны, Сяргея Багданава з Лёзна, адразу накіравалі ў Туркменію, – успамінае Міхаіл Генадзьевіч. – Там вучыліся шэсць месяцаў, затым адправілі ў Афганістан. Я і Лёня служылі далей у горадзе Баграм у складзе 781 асобнага разведбатальёна. Быў танкістам. Хоць пад бранёю, здавалася б, адчуваеш сябе больш абароненым, але, на самой справе, у вайну небяспечна ўсюды. Адслужыўшы толькі месяц, атрымаў першае раненне. А было так. Аднойчы, калі ўвайшлі ў кішлак, камандзір першым вылез з танка і паклікаў нас да сябе. Раптам побач разарваўся снарад, параніла ўвесь экіпаж. Мне асколак трапіў у плячо. Раненне было лёгкім і ў баграмскім шпіталі я прабыў нядоўга. Затым ваяваў цэлы год, і ніводная куля мяне не зачапіла. Відаць, лёс шкадаваў. А на вачах гінулі іншыя. Забыць тыя страшныя моманты, калі хлопцаў адпраўлялі на радзіму ў цынкавых дамавінах, немагчыма. Тады, у васямнаццаць гадоў, я зразумеў, што значыць жыць, бачыць гэты свет, дыхаць, любіць сваіх родных, жадаць хутчэй сустрэцца з імі.

І сустрэча з бацькамі нечакана адбылася ў шпіталі ў Растове, калі Міхаіл быў прыкаваны да ложка. Цяжка параненага, яго перавозілі са шпіталя ў шпіталь. Баграм, Кабул, Ташкент... У Растове медыкі прынялі канчатковае рашэнне – камісаваць. Але толькі праз некалькі месяцаў хлопец змог вярнуцца дадому. Праз некаторы час, больш-менш паправіўшыся, уладкаваўся механізатарам у калгас.

Тут, у Пушках, Міхаіл пазнаёміўся з Тамарай, маладым бухгалтарам, якая прыехала сюды па размеркаванні. Дзяўчына яму спадабалася адразу, але сцяжынку да яе сэрца шукаў цэлых тры гады. Нарэшце Тамара Уладзіміраўна стала яго жонкай. Нарадзіліся сын Валодзя і дачка Ірына. Ад калгаса атрымалі дом, які цяпер ужо прыватызавалі. У ім утульна, цёпла і на падворку ўзорны парадак. Увесь час трымаюць хатнюю гаспадарку. На вёсцы Расколавых цэняць як добрых працаўнікоў і гаспадароў.

– Час ідзе хутка. Вось і малодшая Ірынка ўжо вырасла, сёлета паступіла ў Віцебскі педагагічны ўніверсітэт, займаецца на гістарычным факультэце, – з гонарам кажа бацька.

У Пушках жывуць матуля Міхаіла Генадзьевіча і брат Сяргей. Яны дапамагаюць адзін аднаму, па святах збіраюцца ўсе разам. Па словах былога афганца, сапраўднае шчасце – гэта проста жыць і радавацца, што жывеш пад мірным небам.

**Таццяна Ігнаценка**